## Электронны бюлетэнь: ЛГБТК+ у Беларусі

*11-12.2025*

**ЗМЕСТ:**

1. Становішча беларускай ЛГБТК+ супольнасці
2. Асвятленне ЛГБТК+ тэматыкі ў беларускіх масмедыя
3. Навіны Праваабарончай ініцыятывы “Журналісты за талерантнасць” (J4t) / Gpress.info

### 1. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКАЙ ЛГБТК+ СУПОЛЬНАСЦІ

У перыяд з лістапада па снежань 2025 года ЛГБТК+ людзі ў Беларусі жылі ў атмасферы страху і прыгнечанасці праз тое, што неўзабаве, *12 студзеня 2026 года*, уступаюць у моц заканадаўчыя акты, ухваленыя беларускімі ўладамі, якія даюць абсурдныя падставы, што супярэчаць здароваму сэнсу, Канстытуцыі і міжнароднаму праву, для пераследу і дыскрымінацыі ЛГБТК+ людзей толькі за тое, кім яны нарадзіліся і кім яны ёсць, а таксама для цкавання іх сем’яў і блізкіх.

Праваахоўныя органы Беларусі працягваюць аказваць ціск на прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці. Гэтак прадстаўнікі сілавых структураў выклікаюць гомасексуальных мужчынаў “на размовы” ў міліцэйскія пастарункі па надуманых прычынах у якасці “сведкаў” і схіляюць іх да “супрацоўніцтва”, як паведамляе Еўрарадыё.

Ужо ў аддзяленні ў хлопцаў адымаюць сотавыя тэлефоны, чытаюць ліставанне і падключаюць смартфоны да кампутара. Калі знаходзяць інфармацыю, якая сведчыць да прыналежнасці асобы да ЛГБТК-супольнасці, схіляюць да “супрацы”, то бок выяўленне іншых ЛГБТК-людзей у Беларусі.

Супрацоўнікі сілавых структураў пагражаюць распавесці пра арыентацыю запрошаных ЛГБТК-асобаў сваякам і на працы.

Варта нагадаць, што, згодна з пастановай Міністэрства культуры Беларусі № 24, прынятай 19 сакавіка 2024 года, простае публічнае з'яўленне квір-асобы або публічная падтрымка ЛГБТК+ супольнасці і асоб афлайн або ў сацыяльных сетках лічыцца ў Беларусі актам “парнаграфіі”, які караецца *пазбаўленнем волі на тэрмін да дзесяці гадоў* (артыкул 343 Крымінальнага кодэкса Беларусі).

Новыя папраўкі да Закона Беларусі *“Аб абароне дзяцей”* былі прынятыя ў другім чытанні парламентам Беларусі 12 ліпеня 2025 года ў якасці Закона № 87-З. Як пазначалася вышэй, яны ўступаюць у сілу праз шэсць месяцаў, гэта значыць *12 студзеня 2026 года.*

Згодна з заканадаўчымі папраўкамі, пералік інфармацыі, якая лічыцца шкоднай для ***псіхалагічнага*** здароўя і развіцця дзіцяці, быў пашыраны шляхам дадання інфармацыі, *“накіраванай на прапаганду гомасексуальных адносін, змены полу, педафіліі і бяздзетнасці”.* Гэта фактычна пазбаўляе маладых людзей доступу да інфармацыі аб аднаполых адносінах і змене полу. Таксама на іх бацькоў, настаўнікаў, журналістаў і іншых асоб ускладаецца юрыдычная адказнасць за наданне дзецям любой інфармацыі пра ЛГБТІК+ або за тое, што яны самі з'яўляюцца квір-асобамі.

Папраўкі ў закон суправаджаюцца праектам артыкула 19.16 Адміністрацыйнага кодэкса Беларусі, які прадугледжвае адміністрацыйную адказнасць за «прапаганду гомасексуальных адносін, змены полу, бяздзетнасці і педафіліі».

## 2. АСВЯТЛЕННЕ ЛГБТК+ ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МАСМЕДЫЯ

Беларускія дзяржаўныя і праўладныя СМІ дасягнулі апагею з нарастальнай дынамікай у 2025 годзе, фарміруючы вобраз “пагрозы” з ЛГБТК+ людзей, абвінавачваючы іх у разбурэнні традыцыйных каштоўнасцяў, “уцягванні дзяцей” і, нібыта, “замежным уплыве”.

Даследчая група J4t прадставіла вынікі свайго традыцыйнага маніторынгу мовы варожасці ў дачыненні да ЛГБТК+ у беларускіх СМІ за перыяд са студзеня па кастрычнік 2025 года. Вынікі маніторынга і, у прыватнасці, усё больш частотнае ужыванне мовы варожасці ў дачыненні ЛГБТК+ людзей у беларускіх праўладных СМІ, наводзяць на думку пра пэўныя камунікацыйныя стратэгіі беларускіх уладаў па абясцэньванні суцэльнай катэгорыі ЛГБТК+ асобаў, якія жывуць у Беларусі. Калі пашукаць гістарычныя паралелі ў сусветнай гісторыі, выяўляецца, што падобнае наўмыснае і стратэгічнае абясцэньванне групаў асобаў паводле той ці іншай прыкметы – вельмі небяспечны трэнд, які прыводзіў да масавых злачынстваў на глебе варожасці і генацыду.

- У 2025 годзе 52% публікацыяў у СМІ ўтрымлівалі некарэктную лексіку і 48% - карэктную. Доля некарэктных матэрыялаў у СМІ зноў, як і ў папярэдні год, некалькі перавышае долю карэктных.
- У выніку мэтаскіраванага распальвання варожасці беларускімі ўладамі да ЛГБТК-супольнасці праз падкантрольныя дзяржаўныя і калядзяржаўныя СМІ, як і ў 2022-2024 гадах, у 2025 годзе кожная другая публікацыя на тэму ЛГБТК+ у беларускіх СМІ ўтрымлівала праявы мовы варожасці. Хаця альтэрнатыўная рэпрэзентацыя ЛГБТК-супольнасці ў незалежных медыях існуе, мова варожасці ў дачыненні да ЛГБТК-людзей у беларускай медыяпрасторы пераважае.

- У 2025 годзе зноў, як і ў 2022-2024 гадах, назіралася сітуацыя, калі для распальвання варожасці выкарыстоўвалася карэктная лексіка. Што датычыцца некарэктнай лексікі, у пераважнай большасці выпадкаў ёй спадарожнічалі праявы мовы варожасці.
- СМІ, якія былі прызнаныя афіцыйнымі ўладамі Беларусі “экстрэмісцкімі”, асвятлялі ЛГБТК+ тэматыку ў 2025 годзе максімальна карэктна. “Неэкстрэмісцкія” СМІ, наадварот, распальвалі варожасць. Вынікі маніторынга паказваюць оруэлаўскую карціну, калі 91% публікацыяў пра ЛГБТ-людзей на т.зв. “экстрэмісцкіх” рэсурсах карэктныя і толькі 9% утрымліваюць некарэктную лексіку. І толькі ў 3% выпадкаў сустракаюцца праявы мовы варожасці. У той самы час, “неэкстрэмісцкія” СМІ, якія пераважна прытрымліваюцца афіцыйнай пазіцыі рэжыму, карэктна прадстаўляюць гэту тэму ўсяго ў 22% публікацыяў і некарэктна ў 78% журналісцкіх матэрыялаў. Пры гэтым мова варожасці ў дачыненні да ЛГБТК+ утрымліваецца ў 80% публікацыяў. Такім чынам, з кожных 10 матэрыялаў афіцыйных і каляафіцыйных СМІ 8 распальваюць нянавісць да ЛГБТК-людзей.



## 3. НАВІНЫ ПРАВААБАРОНЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ “ЖУРНАЛІСТЫ ЗА ТАЛЕРАНТНАСЦЬ” (J4T) / GPRESS.INFO

Праваабарончая ініцыятыва «Журналісты за талерантнасць» падвяла вынікі J4T AWARDS – штогадовага конкурсу для журналістаў_ак і рэдакцыяў СМІ, якія накіраваны на павышэнне прафесійных стандартаў у асвятленні тэмаў роўнасці, недыскрымінацыі і правоў уразлівых групаў у Беларусі.

Конкурс ладзіцца з мэтай развіцця сацыяльнай журналістыкі, падтрымкі інклюзіўнага падыходу ў медыя і павышэння пазітыўнай бачнасці розных уразлівых супольнасцяў. У 2025 годзе журы разглядала матэрыялы, апублікаваныя з 1 лістапада 2024 да 31 кастрычніка 2025 года.

У longlist J4T AWARDS 2025 увайшло 57 адзінак кантэнту – тэксты, падкасты і відэа. Свае працы падалі 24 аўтары і аўтаркі, а таксама творчыя калектывы.

22 матэрыялы былі прысвечаныя тэме ЛГБТК+, 9 – пра вымушаную міграцыю, 6 – пра гендэрную роўнасць. Іншыя тэмы, на якія прадстаўлены конкурсныя матэрыялы ўключалі пытанні ментальнага здароўя, інваліднасці, ВІЧ+, расізму, харасмэнту, эйджызму, палітвязняў, рэлігіі і паўнамаштабнай вайны Расеі ва Украіне.

**Намінацыя «Найлепшы матэрыял»**

У гэтай намінацыі прымаліся артыкулы, фотарэпартажы, відэаматэрыялы, падкасты і радыёперадачы, якія прасоўваюць ідэі роўнасці і недыскрымінацыі.

**1-е месца**

***Марына Міхайлава, онлайн-медыя «Салідарнасць»***

Матэрыял: «Когда я получил первый отказ, думал: может, это со мной что-то не так, я недостаточно подробно рассказывал на интервью, растерялся, не был убедителен?».

Гісторыя беларускага ЛГБТК-актывіста, які больш за два гады спрабуе атрымаць міжнародную абарону ў Балгарыі. Нягледзячы на адказы судоў, ён не здаецца.

**2-е месца**

***Аліса Сармант, Анна Сергеевіч, матэрыял апублікаваны на сайце TG House – беларускай транс-арганізацыі.***

Матэрыял: «Идентичность под запретом: почему ЛГБТК+ сообщество в Беларуси стало объектом репрессий?»

Аўтаркі сабралі сведчанні беларускіх квір-людзей, якія сутыкнуліся з затрыманнямі, гвалтам, сфабрыкаванымі абвінавачваннямі і вымушанай эміграцыяй. Асабістыя гісторыі дапоўнены каментарамі экспертаў і міжнародных ЛГБТК+ арганізацый.

**3-е месца**

***Кацярына Кулакова, онлайн-медыя «Салідарнасць».***

Матэрыял: «Татьяна Журавская – “Не все знают о своем положительном ВИЧ-статусе. Есть дискриминация, стигматизация, преследование”»

Інтэрв’ю з ВІЧ-актывісткай і кіраўніцай фонду Step by Step пра дыскрымінацыю, з якой сутыкаюцца ВІЧ+ людзі ў Беларусі і эміграцыі, а таксама пра наступствы знішчэння некамерцыйных арганізацый у краіне.

Пераможцаў вызначыла журы, у склад якога ўвайшлі рэдактаркі і рэдактары беларускіх СМІ.

Першыя тры месцы будуць узнагароджаны ганаровымі граматамі, а пераможца атрымае адмысловым прыз: удзел у асветніцкай паездцы ў адну з краінаў Еўропы ў 2026 годзе.

**Асоба года**

**Аліса Сармант** (TG House) – пераможца адмысловай намінацыі J4T за сістэмную падтрымку ЛГБТК+ супольнасці ва ўмовах рэпрэсій і вымушанай міграцыі. Пераможца адыгрывае значную ролю ў арганізацыі эвакуацыі ЛГБТК+ людзей, якія апынуліся ў небяспецы, суправаджае працэсы адаптацыі пасля пераезду, а таксама ініцыюе і каардынуе адукацыйныя, інфармацыйныя і падтрымліваючыя анлайн- і афлайн-мерапрыемствы.

Праца Алісы Сармант спрыяе ўмацаванню салідарнасці, павышэнню бачнасці праблемаў уразлівых групаў і абароне правоў ЛГБТК+ людзей у Беларусі і за яе межамі.

Лаўрэатку вызначылі сябры каманды праваабарончай ініцыятывы «Журналісты за талерантнасць».

**Рэдакцыя года**

У 2025 годзе намінацыя «Рэдакцыя года» не была прысуджаная, бо ніводная з рэдакцый не набрала істотнай перавагі падчас галасавання прадстаўнікоў НДА і індывідуальных актывістаў.

Вэб-сайт Gpress.info / Gaypress.eu працягваў рэгулярна інфармаваць беларускую ЛГБТК+ супольнасць у Беларусі і ў выгнанні аб стане іх правоў, даючы парады пра тое, дзе атрымаць дапамогу і як заставацца ў бяспецы ўнутры краіны, а таксама як дабрацца да бяспечнага месца ў выпадку форс-мажорных становішчаў, у тым ліку пагрозы крымінальнага і адміністрацыйнага пераследу за адкрытую квір-пазіцыю ў краіне.

Gpress.info ў сацыяльных сетках і мессенджерах:

TikTok

Telegram

Facebook

Instagram

VK

Twitter

YouTube

Электронная пошта: gaypresseu@gmail.com

**© Праваабарончая ініцыятыва “Журналісты за талерантнасць”, 2025**

*Спасылка на Праваабарончую ініцыятыву “Журналісты за талерантнасць” пры выкарыстанні матэрыялаў Электроннага бюлетэня “ЛГБТК+ у Беларусі” з’яўляецца абавязковай.*